ми к профессиональной деятельности в данной области, с одной стороны, и отсутствием специальной гендерной подготовки педагогов, с другой.

ЛИТЕРАТУРА


1. Гендерный подход в дошкольной педагогике: теория и практика / под ред. Л.В. Штылевой. – Мурманск: ОУ КРЦДОиРЖ, 2001. – 200 с.
2. Кон, И.С. Ребенок и общество/ И.С. Кон. – М.: Академа, 2003. – 336 с.
3. Суковатая, В. Фениниская педагогика как практика мультикультурализма / В. Суковатая // Высшее образование в России – №10 – 2004. – С.147 – 149.
4. Хрестоматия к курсу: Основы гендерных исследований / Ред. совет: О.А. Воронина, Н.С. Григорьева, Л.Г. Лунякова. – М.: МЦГИ – МВШСЭН–МФФ, 2001. – 368 с.


## МАГЧЫМАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ ЭТНІЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ СТУДЭНТАЎ ФСП і П, ЯКІЯ НАВУЧАЮЦЦА ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "САЦЫЯЛЬНАЯ РАБОТА", ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КУРСА "ЭТНАПЕДАГОГІКА"


**А.Л. Міхайлава**

*Віцебск, ВДУ*


Мэтанакіраванае фарміраванне этнічнай самасвядомасці беларускай моладзі патрабуе гісторыка-педагагічнага абгрунтавання яе стратэгіі. Гістарычныя традыцыі беларускага народа, што складаюць аснову этнапедагогікі, павінны актыўна выкарыстоўвацца ў сучасным выхаваўчым асяроддзі.

Беларусы, як і любы іншы этнас, "уяўляюць сабой арыгінальны (непаўторны) калектыў людзей, аб'яднаны этнічнай свядомасцю, якая мае псіхолага-генетычную аснову" [1, 230]. Этнас узнікае пры ўдзеле прыродна-геаграфічных, геапалітычных фактараў і ўяўляе сабой сістэму, якая складаецца з субэтнасаў і этнаграфічных груп. Прадстаўнікі любога дадзенага этнасу ўсведамляюць сваю адметнасць у параўнанні з прадстаўнікамі іншых этнічных калектываў, і гэта ўсведамленне выяўляюць у непаўторных паводзінах (г.зн. светаўспрыманні і бачанні сябе, сваёй ролі ў гэтым свеце), у традыцыях і звычаях, і нарэшце, у легендах і паданнях, казках, прыказках і прымаўках, г.зн. – у мове, якая ўяўляе сабой адну з праяў этнічнай арыгінальнасці.

Сацыяльна-прыроднае асяроддзе, што ўтварылася ў выніку гістарычнага развіцця беларускага народа, асаблівасцей гаспадарчага ўкладу, грамадскага жыцця, геаграфічнага асяроддзя, прыродных умоў, рэлігіі, абумовіла фарміраванне беларускай ментальнасці. Апошняя з'явілася вызначальнай у фарміраванні своеасаблівай сістэмы народных выхаваўчых сродкаў і метадаў беларусаў. Сродкі і метады беларускай народнай педагогікі, безумоўна маючы агульнаславянскія карані, разам з тым вызначаюцца нацыянальнай адметнасцю, што выяўляецца ў іх моўным і дзейным змесце, спецыфіцы традыцыйна-побытавай культуры і вуснанароднай творчасці, практычным напаўненні і спалучэнні, асаблівасцях выкарыстання.

Нацыянальная псіхалогія беларускага народа і яго менталітэт вызначылі адметныя рысы народна-педагагічнага ідэалу, якімі з'яўляюцца справядлівасць, калектывізм (як вынік абшчыннага быцця); стрыманасць, асцярожнасць, нешматслоўнасць (склаліся ў працэсе цяжкага паднявольнага жыцця, спусташальных

Репозиторий ВГУ

войнаў); прастадушнасць, міралюбівасць, памяркоўнасць, надзвычайная талерантнасць (звязаны з адсутнасцю міжнацыянальнай варожасці і наяўнасцю верацярпімасці да прадстаўнікоў розных рэлігійных канфесій, а таксама арыентацыі на агульнасацыяльныя каштоўнасці).

Дадзеныя рысы як ментальныя якасці беларускага народа адлюстраваліся ў яго вуснай народнай творчасці, у працы, паводзінах, грамадстве, культуры і знайшлі сваё выяўленне ў грамадскім ідэале беларусаў. У ходзе гістарычнага развіцця Беларусі пад уздзеяннем асаблівасцей гістарычнага лёсу, менталітэту і рэгіёну пражывання паступова складваліся свае ўяўленні пра "дасканалага чалавека" як ідэал для падрастаючага пакалення. Ідэалам беларусаў з'яўляўся чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, фізічна здаровы, моцны, высокамаральны. Да нашага часу з глыбіні вякоў дайшлі найкаштоўнейшыя звесткі пра асноўныя накірункі станаўлення і развіцця грамадскага ідэалу асобы на ўсіх этапах шматвяковай гісторыі Беларусі, што знайшло сваё выяўленне ў працах нацыянальных асветнікаў, пісьменнікаў і вучоных. Захаванне вышэйзгаданага ідэалу характэрна і для сучаснага грамадства, бо нягледзячы на міжнацыянальныя ўзаемадзеянні, беларусы захавалі сваю нацыянальна-гістарычную адметнасць, чаму спрыяла захаванне ў пакаленнях народна-педагагічнага ідэалу, якое адбываецца, на думку даследчыка беларускай народнай педагогікі В.С. Болбаса, "дзякуючы трансляцыі з пакалення ў пакаленне найбольш стабільных маральна-духоўных каштоўнасцей і ментальных якасцей адпаведнага соцыуму, а таксама ўзбагачэнню іх агульначалавечымі каштоўнасцямі цывілізацый, бо ідэал выконвае важную менталеўтваральную функцыю і садзейнічае не толькі захаванню, але і карэкцыі і пераўтварэнню каштоўнасных жыццёвых арыенціраў" [3, 150].

Адной з вучэбных дысцыплін, што можа выкладацца будучым спецыялістам гуманітарнага профілю, з'яўляецца этнапедагогіка. Менавіта яна актыўна ўплывае на фарміраванне этнічнай самасвядомасці.

Этнапедагогіка разглядаецца ў навуковым свеце як навука, у аснову якой пакладзена выхаваўчая практыка народа, што перадаецца з пакалення ў пакаленне не проста шляхам капіравання метадаў і прыёмаў выхавання, а праз пастаяннае і мэтанакіраванае ўдасканаленне назапашанага вопыту згодна з канкрэтным выхаваўчым асяроддзем, умовамі жыцця і поглядамі асобнай сям'і ды з каштоўнаснымі арыентацыямі грамадства.

Пры выкладанні курса "Этнапедагогіка", якое, дарэчы, адбываецца на беларускай мове, улічана разнастайнасць тэм, практычных і творчых заданняў, магчымасць выбару тэматыкі даследчага праекту. Тэматыка семінарскіх заняткаў цесна звязана з вывучэннем працэсу фарміравання нацыянальна вызначанай асобы беларуса (педагагічная культура і духоўны прагрэс народа; народны ідэал чалавека як сутнасць народнага выхавання; сродкі этнапедагогікі як шляхі дасягнення народнага ідэалу; увасабленне ідэй беларускай народнай педагогікі ў фальклоры; этнапедагогіка гульні; віды народнага выхавання). Заданні размеркаваны па мэце на вучэбныя (напрыклад, пабудаваць схему ўзаемасувязі этнапедагогікі з іншымі навукамі; раскласіфікаваць метады беларускай народнай педагогікі па пэўнай прыкмеце) і творчыя (напрыклад, скласці сцэнарый свята або віктарыну народных прыказак і прымавак, інсцэніраваць беларускую народную казку, анекдот, прыкмету ці павер'е (на выбар)). Студэнты на пачатку вывучэння курса выбіраюць пэўную тэму ўласнага даследчага праекту, звязанага з відамі народнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: працоўным, маральным, фізічным, разумовым, эстэтычным, рэлігійным – і пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў назапашваюць матэрыял для даследавання паступова: спачатку збіраюць фактыч-



Рэпазіторый ВДУ

ны матэрыял, абгрунтоўваючы народны ідэал беларусаў (прыказкі, прымаўкі, казкі, легенды і паданні, песні, жарты і анекдоты, прыкметы і павер'і); затым падбіраюць і апісваюць комплекс сродкаў і метадаў, звязаных з абраным відам выхавання для даследавання; складаюць метадычны матэрыял згодна з праблематыкай даследавання; афармляюць праект і выступаюць з вынікамі даследаванняў. Для большай доказнасці прыводзім прыклад планаў семінарскіх заняткаў па этнапедагогіцы для студэнтаў факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, што атрымоўваюць спецыяльнасці "Сацыяльная работа (сацыяльна-педагагічная дзейнасць)", "Сацыяльная педагогіка. Практычная псіхалогія".

Такім чынам, студэнты падчас выкладання этнапедагогікі спазнаюць сваю духоўную лучнасць з продкамі, вывучаючы асаблівасці педагагічных ідэй і практыкі беларусаў у выхаванні падрастаючых пакаленняў, далучаючыся праз азнаямленне з народнымі святамі, абрадамі, звычаямі і традыцыямі да пераемнай сувязі паміж пакаленнямі.

ЛІТАРАТУРА


1. Рогалев, А.Ф. Белая Русь и белорусы (В поисках истоков). – Гомель, 1994. – 267 с.
2. Мельнікаў, А. Характар і менталітэт беларусаў // Беларуская думка. – 1997. – №7. – С.101-110.
3. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 175 с.


## ФОРМИРОВАНИЕ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ ТРАЕКТОРИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО СТАНОВЛЕНИЯ БУДУЩЕГО СПЕЦИАЛИСТА: ПОЛИКУЛЬТУРНЫЙ АСПЕКТ


**А.П. Орлова**
*Витебск, ВГУ*


Совершенствование системы образования, переход от знаниевой парадигмы к личностно-ориентированной предполагает пересмотр сложившейся системы профессиональной подготовки будущих специалистов. Качественно меняется позиция студентов в образовательном процессе. Появляется возможность и необходимость индивидуализации профессиональной подготовки специалистов. Это проецирует внимание на выстраивании индивидуальной образовательной траектории студента.

Индивидуальная образовательная траектория означает осознанный выбор студентом направления и содержания подготовки, а также продолжительность образовательного пространства.

Основной характеристикой научно-методического обеспечения условий реализации будущим специалистом индивидуальной образовательной траектории в вузе в системе многоуровневого, многовариантного образовательного процесса является диверсификация. Ее следует рассматривать через призму многофункциональности конкретного учебного заведения, вариативности и гибкости реализуемых образовательных программ в соответствии с национальной спецификой региона (учет национальной региональной образовательной и культурной традиции) и принципа поликультурности, позволяющего прогнозировать возможность конкурентноспособности будущего специалиста на международном рынке труда. Главная цель диверсификации – удовлетворение интересов личности студента в

Репозиторий ВГУ